Алег Трусаў

# Мы не станем суверэннай незалежнай нацыяй, пакуль не аб'яднаемся вакол ідэі нацыянальнага адраджэння



*— Алег Анатолевіч! Сёння, бадай, нікому нельга застацца ў баку, не адчуваць сваю прыналежнасць да трагічнай і ў той жа час вялікай гісторыі нашай дзяржавы, карані якой вядуць у глыбіню вякоў. Гісторыі, кажуць, прыдатна паўтарацца. І вось пагадненне ў „Белавежскай пушчы" „траіх", распад Саюза і сатварэнне Садружнасці...*

— Адно можна сказаць з упэўненасцю: Белавежскае пагадненне стала для Беларусі той адпраўной кропкай руху да сваёй страчанай дзяржаўнасці і суверэнітэту. Пакутлівага, супярэчліва-цяжкага, але паступальнага руху. На гэтым шляху нам неабходна разабраць завалы разбураных імперскіх узвядзенняў, востры дэфіцыт вопыту несілавога ціску, эканамічны распад. І вельмі неабходна ўсім нам, незалежна ад палітычных схільнасцей і поглядаў, засяродзіцца на праблемах выжывання нацыі, разабрацца, хто мы такія — беларусы, дзе нашы карані, якое месца займае Беларусь у геапалітычнай прасторы. Было б незразумела і недаравальна, калі б Беларусь не выкарыстала такія спрыяльныя ўмовы.

*— Для адных — перабудова, а для тысяч і тысяч — развал, міжусобіца, крах ілюзій і надзей. Не толькі людзі — сама Садружнасць пазірае на сябе ж з недаверам — за апошнія гады сотні тысяч людзей гэтак спакутаваліся, ды што там казаць пра пакуты, голад, — іх пад лозунгамі дэмакратыі і гуманізму проста забівалі... і ўсё тыя ж „дэмакраты" ды наваўленыя "бацькі" дэмакратыі. Прыклад — тыя ж Грузія, Асеція, Таджыкістан... А што практычна змянілася ў Беларусі? Была "наменклатура", яна і засталася. Ніхто ад сваіх прывілей не адмовіўся. Выпадковыя людзі, якія дарваліся да ўлады, распрадаюць нацыянальныя багацці беларусаў, усюды адбываецца бескантрольная "прыхватызацыя".*

— Так, мы перажываем вельмі няпросты перыяд.



З народным дэпутатам Беларусі, Старшынёй Камісіі па забеспячэнню адзінай палітыкі выкарыстання дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета, Старшынёй ЦК Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады Алегам Т р у с а в ы м гутарыць журналіст Анатоль А н д р у х о в і ч.

Сапраўды, дзяржаўны лад Беларусі ва ўмовах яе новага статусу патрабуе сур'ёзнай мадэрнізацыі і абнаўлення. І ўсё ж нават нашы недобразычліўцы прызнаюць: Беларусь, дзякуючы мудрасці і сталасці свайго народу, здолела без асаблівых узрушэнняў, і тым больш без вайны і крыві, прайсці праз перыяд распаду, эканамічны крызіс. Мы пазбегнем новых небывалых патрасенняў і эканамічных выпрабаванняў, калі аб'яднаемся вакол нацыянальнага Адраджэння. Толькі наша гістарычная ідэя нацыянальнага Адраджэння і пабудовы незалежнай дзяржавы Беларусь дасць нам сілы і аб'яднае ў змаганні з сіламі рэакцыі, з эканамічнай разрухай, палітыкай асіміляцыі. Калі мы захаваемся як суверэнная, незалежная дзяржава, мы хутка выйдзем з паласы эканамічнага заняпаду.

*— Але як абараніцца ад самавольства чыноўнікаў, хабарніцтва, разгулу бюракратыі, якая сёння нічога і нікога не баіцца. Нездарма Беларусь называюць "вотчынай няпужанай наменклатуры". Практычна на ўсе кіруючыя пасады прыйшлі людзі з былой камуністычнай закваскай і незадаволеным інстынктам "цягнуць і хапаць". Сёння як ніколі раней востра ставіцца пытанне аднаўлення былой кампартыі Беларусі. Тэндэнцыі камуністычнай рэстаўрацыі носяць адкрыты антыдзяржаўны, антыбеларускі, антынацыянальны характар. Сёння гэтым людзям практычна аддадзена эканоміка, яны кантралююць многія ідэалагічныя органы, сродкі масавай інфармацыі.*

— Аб'ектыўна кажучы, замяніць сёння ўсіх гэтых людзей практычна немагчыма. Іншая справа — неабходна было стварыць іншыя ўмовы іх дзейнасці, надзейны кантроль. Мы гэтага не зрабілі і ў выніку адбылося тое, што мы маем — у вышэйшых уладных структур яшчэ больш стала ўлады і ўплыву. І асабліва — у сферы размеркавання. Сёння яны размяркоўваюць дзяржаўную ўласнасць, карыстаючыся сваім службовым становішчам, іх усеўладдзе ў

працэсе прыватызацыі, якую ў народзе вельмі трапна назвалі "прыхватызацыяй", прыводзіць, ды ўжо, несумненна, прывяло, да адкрытага цынізму, карупцыі, зліцця з мафіёзнымі структурамі.

Гэта і стала той галоўнай прычынай, улічваючы якую на апошняй сесіі Вярхоўнага Савета самым сур'ёзным чынам было пастаўлена пытанне аб прыпыненні падобнай прыватызацыі. Тым больш, што незаконнае рашэнне аб забароне рэферэндуму паставіла цяперашні Вярхоўны Савет у складаныя ўмовы, як нелігітымную ўстанову, заканадаўчыя акты якой з 29 кастрычніка практычна не маюць легітымнага характару — законы, якія будуць прымацца, практычна не маюць сілы. Вядома, у гэтых умовах цяжка нешта прадказаць, але ўсё тое, пра што папярэджвала апазіцыя БНФ, збываецца. Мы падыйшлі да таго рубяжу, калі дзяржаве неабходна пусціцца ў аўтаномнае плаванне па штармавому рынкаваму акіяну. Трэба ўводзіць уласныя грошы, прымірыцца з узроўнем сусветных цэн на галоўныя віды сыравіны і энерганосьбіты, мацаваць свае ўласныя граніцы, сваю нацыянальную армію. Без умацавання беларускай дзяржавы, з аглядкай выключна на адзіную рублёвую зону, на эканоміку толькі Расіі, мы не ўмацуем нашу незалежнасць, нашу нацыянальную палітыку. Без развіцця нацыянальнай культуры ўвогуле неэфектыўныя ніякія эканамічныя рэформы, ніякая ўяўная дэмакратыя. Мы будзем будаваць замкі на пяску, як ужо працуем амаль цэлы год, падараваўшы Расіі звыш ста мільярдаў нашых кроўных "зайчыкаў". Страціўшы свой суверэнітэт, мы не зможам карыстацца вынікамі сваёй працы, нацыянальнымі багаццямі — гэта будуць спажываць іншыя, а мы кінуты ў беднасць, рабства і паступовае выраджэнне.

*— Алег Анатолевіч! Сёння як ніколі абудзіліся імперскія і калабарацыянісцкія сілы, якія, умела выкарыстоўваючы цяжкасці нашага духоўнага ўздыму, вядуць сапраўдны наступ на беларускую культуру, мову, адраджэнне гістарычнай спадчыны.*

— Трэці год дзейнічае ў рэспубліцы Закон аб мовах, якім вызначаны статус нацыянальнай мовы Беларусі як адзінай дзяржаўнай. Гэтая важнейшая для нацыянальна-дзяржаўнага развіцця народа Беларусі прававая норма замацавана ў дзеючай Канстытуцыі і Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, якія былі прыняты ў адпаведнасці з воляй беларускага народа Вярхоўным Саветам. Я не думаю, каб яны падвяргаліся падобнай рэвізіі. У той жа час шэраг народных дэпутатаў, пры абмеркаванні праекта Канстытуцыі ў другім чытанні, выступілі з прапановай замацаваць за рускай мовай статус другой дзяржаўнай мовы рэспублікі. Гэтаму антынацыянальнаму ўчынку папярэднічала шырокая і яўна загадзя спланаваная ў сродках масавай інфармацыі кампанія за перагляд Закона аб мовах і усталявання ў Беларусі так званага двухмоўя. За гэтым, дарэчы, бачацца далёка ідучыя мэты — спыніць працэс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, унесці напружанасць у межнацыянальныя адносіны ў рэспубліцы і стварыць умовы, у выніку якіх становіцца магчымым скасаванне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.

*— І гэта зыходзіць ад народных выбраннікаў! Ды якія ж яны "народныя"! Гэта — духоўныя манкурты. Ад іх зыходзіць той небяспечны "вірус манкуртызму", якім сёння паражоны так званы "баявы атрад учарашніх", які не шкадуе жывата свайго дзеля аднаўлення былога СССР, увасаблення сталінскага сацыялізму, таталітарнага рэжыму і выкрыцця іншадумцаў-дэмакратаў.*

— Мне не хацелася б у гэтым бачыць нейкі злы намер. Аўтарам азначаных вышэй выступленняў, як бачна, не хапае гістарычнай кампетэнтнасці і дасведчанасці. Гэта не іх віна, гэта іх бяда — уся прычына ў недасведчанасці і неадукаванасці — гэтага яшчэ ў нас вельмі шмат, няма тут выключэння і ў верхніх эшалонах улады. Уявіце сабе, што столькі гадоў усіх нас мэтанакіравана аглушала заідэалагізаваная, антынацыянальная пабойня. Трагедыя іх у тым, што яны не толькі не ведаюць гісторыі сваёй дзяржавы Беларусь, яны і не хочуць яе ведаць, і больш за тое — ганарацца гэтым. Вось мы і дажыліся да таго стану, што даверылі пісаць законы для суверэннай Беларусі дзяржаўным людзям, якія не ведаюць і не хочуць ведаць ні гісторыі, ні культуры, ні мовы таго народа, які яны прадстаўляюць у вышэйшым заканадаўчым органе. Абсурд, магчымы хіба толькі ў нас. Ну, а што датычыць самой мовы, то скажу, што за час, які прайшоў з моманту прыняцця Закона аб мовах, у рэспубліцы шмат што змянілася. У нас сёння больш паловы школ — беларускамоўныя. Мяняецца сітуацыя ў вышэйшых навучальных установах. Студэнцтва становіцца прымае пераход навучальнага працэсу на дзяржаўную мову. Больш трывогі выклікаюць самі выкладчыкі — прафесары, дацэнты, асістэнты, а таксама іх кіраўнікі. Многія не хочуць дадатковай працы ў імя пачэснай ідэі пабудовы беларускай вышэйшай школы як па зместу, так і па духу. Але і гэтых людзей мы спрабуем, і не без поспеху, абудзіць. Няма сумнення, маладое пакаленне ахвотна далучаецца да глыбінных вытокаў роднай мовы, гісторыі, культуры. За імі — будучыня нашай нацыі.

*— У беларусаў яшчэ не выпрацаваўся інстынкт самазахавання нацыі, так, скажам, як у нашых суседзяў палякаў ці літоўцаў, з кім мы не адно стагоддзе былі ў адной "звязцы". Дык як адрадзіць гэты інстынкт, без якога нам будзе надзвычай дрэнна — можа здарыцца, без яго мы апынемся на задворках гісторыі. Як беларусу стаць мужным, настойлівым, цвёрдым? Ведаю, скажаце, для беларусаў уласцівая мяккасць характару.*

*Маўляў, народ наш надта падатлівы і здольны дараваць любую крыўду, схільны дагаджаць. Дык тую гатоўнасць дагаджаць пастаянна дэманструюць нашы лідэры. Пазайздросціць толькі можна іх здольнасці з усім пагаджацца. У Расіі, напрыклад, пра нас адно сёння кажуць: вы ж, беларусы, гэткія памяркоўныя, бяскрыўдныя, шчырыя, вы гэтулькі напакутваліся, дык мы вас гэтак шкадуем, гэтак шкадуем, а вы ўзялі і Саюз разбурылі.*

— Шкадаваць не трэба. Шкадаваць трэба хворых ды нямоглых. Наш народ яшчэ на нешта ды здольны — рэшт у рэшт сябе пракорміць і не дойдзе да таго стану, што мусіць пайсці па свеце з працягнутай рукою, як, дарэчы, пайшла ўжо Расія. Ну, а наконт цвёрдасці, мусіць, беларусам не пашкодзіла б мець характар, дакладна вызначыць тыя межы, да якіх можна адсту-

пацъ. Гэта асабліва важна ў дзяржаўных справах. Ад урада рэспублікі патрабуецца правядзенне незалежнай, выразнай нацыянальнай палітыкі. Тут патрэбна мець сваю палітычную стратэгію і тактыку, цвёрды курс, сваю пазіцыю. Не толькі мець, але і дастойна іх праводзіць, адстойваць, абараняць, прымусіць іншых лічыцца са сваёй пазіцыяй. Тое датычыць не толькі нашых адносін з Расіяй, але і з іншымі замежнымі дзяржавамі. Мушу заўважыць, што наша цяперашняя знешняя палітыка выдзяляецца сваёй беларускай памяркоўнасцю, гэтакай палітычнай бяззубасцю, непрыкрытай гатоўнасцю ісці ў рэчышчы чужых дактрын і стэрэатыпаў, зведзена да захавання так званага "пратаколу". Не, вядома, ніхто не заклікае лезці на ражон, паказваць сілу, але ж і мужнасць у адстойванні сваіх інтарэсаў таксама трэба мець. Можа, дарэчы, склаўся ў многіх народаў уяўленне пра нас, як пра нацыю, дастойную шкадавання. А тут так: каго шкадуюць, таго ў разлік не прымаюць. З тым не лічацца.

***— Вось, вось... З намі і дагэтуль ніколі не лічыліся. У нашай гісторыі нямала цяжкіх момантаў, якія і сёння балюча смяляць, як нязгойныя раны. У векавым каланіяльным мінулым — вытокі нашай сённяшняй слабасці і нявер'я ў магчымасць абароны нацыянальных інтарэсаў. Як не вайна — больш за ўсіх церпіць беларускі народ. Дык мала нам людных ахвяр, — па жывому рэжуць, ірвуць нашу тэрыторыю. Мы як разменная карта паміж вялікімі народамі-ваярамі. Дастаткова прыгадаць Брэсцкі дагавор 1918 года, дагаворы паміж Расіяй і Літвой ад 12 чэрвеня 1920 г., СССР і Літвой, так званы пакт Рыбентропа-Молатава ў 1939 годзе, пасляваенную перадачу Беласточчыны Польшчы. Інтарэсы Беларусі ніхто не ўлічваў, а самі тыя перагаворы вяліся без прадстаўнікоў Беларусі, з парушэннем этыкі і норм міжнароднага права. А ў выніку — мы страцілі трэць сваёй тэрыторыі.***

— Усё гэта так. З песні, як кажуць, слова не выкінеш. А трагізм лёсу нашай Бацькаўшчыны ў былой інтэрнацыянальнай звышдзяржаве вызначаўся перш за ўсё геапалітычным становішчам этнічнай тэрыторыі Беларусі, прававой неабароненасцю, калі яна станавілася заложніцай імперскай палітыкі, расплочвалася за чужыя авантуры жыццямі мільёнаў сваіх грамадзян, сваёй "крэўнай" тэрыторыяй. Наша задача — адкрыць людзям праўду гісторыі, тое, што беларускія землі былі, ды што там казаць, з'яўляюцца да гэтага часу нейкай вельмі лёгкай здабычай для нашых бліжэйшых суседзяў, дзе робіцца ўсё, каб скажона падаць гісторыю Беларусі, абгрунтаваць свае правы на нашу тэрыторыю, на наш народ, на яго мінулае. Аднак галоснасць і дзяржаўны суверэнітэт даюць выключную магчымасць нашаму народу не толькі самому разабрацца ў сваёй мінуўшчыне, але і распарадзіцца сваёй сучаснасцю і будучыняй.

Нам, дзякуючы нашай талерантнасці, удалося без асаблівых узрушэнняў мірна вырашыць многія спрэчныя пытанні са сваімі суседзямі, не абвастраючы гэткія складаныя пытанні граніц. У эпоху разгула страсцей, эмоцый, не самых гуманных,нам, беларусам, трэба захоўваць пачуццё ўраўнаважанасці, добразычлівасці, аб'ектыўнасці і павагі да сваіх суседзяў, пакідаючы месца для абмеркавання, узгаднення з пазіцый дабрачыннасці многіх спрэчных пытанняў.

***— Наш народ, як хтосьці з беларусаў трапна адзначыў, падобны сёння на таго вязня, які вырваўся з паняверкі з вязніцамі, з кандаламі на нагах. Але ў яго не хапае свядомасці разбіць іх. Ён не ведае, як жыць пры гэтай волі.***

— Беларусаў спрадвеку вызначала чалавечая філасофія. Нашыя людзі ніколі не кідаліся ў крайнасці, імкнуліся да адзінства, вызначаліся талерантствам мыслення, цярплівасцю і павагай да процілеглых думак і іншых народаў, якія жылі побач з імі. Гэта, несумненна, тыповая рыса беларускай нацыянальнай ментальнасці, якая існавала ў ёй з часоў Вялікага княства Літоўскага, дзяржавы, што вызначалася пэўным дэмакратызмам (можна прыгадаць магдэбургскае права) і вялікай талерантнасцю ў духоўна-рэлігійным і нацыянальным жыцці. Рыса гэтая захавалася ў беларускім нацыянальным характары і ў пазнейшыя цяжкія часы, калі беларуская культура змушана была "прарастаць" на вяскоВай глебе, дзякуючы чаму змагла зберагчы сваю першапачатковую цэласнасць і своеасаблівую гарманічнасць. Сам ход беларускага Адраджэння паказвае, што людзі на Беларусі ніколі не парывалі сваіх нацыянальных каранёў. Іншая справа — інтэлігенцыя ў нас, як гэта не парадаксальна, аказалася нігілістычнай, інертнай, а ў нейкай частцы нават варожай да нацыянальнага адраджэння. Але сёння мы павінны канстатаваць той факт, што ўпершыню ў сваёй гісторыі па-сапраўднаму беларускімі сталі нашыя гарады. Прыгадайце даваенны Мінск: у горадзе пражывала толькі каля 20% беларусаў, астатняе насельніцтва — яўрэі, палякі, рускія. Тым больш, практычна адсутнічала ў поўным сэнсе гэтага слова, вынішчаная беларуская інтэлігенцыя. Нават сёння мы можам нагадаць красамоўную статыстыку па гораду Мінску: на кіруючых пасадах толькі 8% беларусаў, а на вытворчасці — 80%. Лічбы красамоўныя і трагічныя. Прымушаюць нас задумацца і стан культурнага, ідэалагічнага забеспячэння. У нас пакуль недастаткова людзей, здольных усприняць і зразумець нацыянальныя праблемы, бачыць шляхі іх вырашэння і быць здольнымі прыцягнуць да гэтага як мага больш патрыётаў. Інтэлігенцыя, вядома, найбольш востра прадчувае палітычныя і сацыяльныя перамены, першай адклікаецца на боль і беды народа. Першай, на жаль, становіцца ахвярай у час жорсткіх выпрабаванняў. Мы вельмі шмат гаварылі, звяртаючыся да мінуўшчыны, што Беларусь многае страціла, бо ў яе няшмат было сапраўдных інтэлігентаў, выхадцаў з народу.

***— Алег Анатолевіч, усе мы — і гісторыкі, і не гісторыкі, выйшлі з "кароткага курсу" гісторыі КПСС. Нам зусім нармальным уяўлялася вывучэнне біяграфій "бацькоў народа", крокаў сажнёвых "непарушнага Саюзу", бясконцай чаргі партыйных пленумаў і з'ездаў. Цяпер не існуе такога паняцця, як "савецкі народ", а ёсць суверэнныя народы, і ў кожнага — уласныя карані і продкі, свая гісторыя. Відаць, і Беларусі прыйшоў час ствараць сваю гісторыю, сваю гістарычную навуку.***

— У рэспубліцы за апошнія год—два зроблена вельмі многа для таго, каб грамадзяне суверэннай Бе-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

ларусі змаглі вывучаць мінулае свайго народу, сваёй дзяржавы. І сёння з перадавой гістарычнай думкай, скажу шчыра, у нас праблем няма. Справа ў тым, што на пачатку перабудовы першымі публіцыстамі, якія панеслі гістарычную праўду "ў народ", сталі ў нас як раз гісторыкі. Ад іх эстафету падхапілі журналісты, інтэлігенцыя, не пакрыўлю душой, скажу, многія народныя выбраннікі — дэпутаты. І вось мы можам смела канстатаваць небывалы ўздым усенароднай зацікаўленасці да сваёй мінуўшчыны. Вядома, гэты працэс неабходна трымаць пад кантролем, даваць яму патрэбны накірунак, пастаянна падпітваць. Камісія Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны разам з вучонымі распрацавала, мне здаецца, слушны план гістарычнай адукацыі насельніцтва, у якім трэба вызначыць некалькі важных этапаў. Першы з іх — стварэнне сапраўды беларускіх гістарычных выданняў. У гэтым накірунку мы дабіліся нядрэнных вынікаў — рэспубліка, не меўшая ні аднаго гістарычнага выдання, сёння мае цэлы шэраг часопісаў і спецыяльных выданняў па гісторыі. Ужо два гады выходзіць "Спадчына" — часопіс Беларускага фонду культуры. Агульнымі намаганнямі грамадскіх арганізацый і фондаў, Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў арганізаваны выпуск гістарычна-публіцыстычнага часопіса "Беларуская мінуўшчына". Вучоныя, студэнты БНУ атрымалі свой "Беларускі гістарычны часопіс". Ёсць рашэнне на выданне ваенна-гістарычнага часопіса "Паходня". Хачу адзначыць, многія сродкі масавай інфармацыі, Беларускае радыё і тэлебачанне, газеты "Звязда", "Голас Радзімы", "ЛіМ", "Настаўніцкая газета" рэгулярна друкуюць цікавыя і даволі разгорнутыя матэрыялы на гістарычную тэму. У выдавецтвах рэгулярна выходзяць невялічкія тонкія кніжкі, разлічаныя на масавага чытача "Забытая слава", вядзецца перавыданне забытых гістарычных кніг такіх вядомых беларускіх асветнікаў, як Ігнатоўскі, Ластоўскі, Смоліч, перавыдаюцца нашыя лепшыя беларускія газеты "Наша ніва", многія хронікі, выходзіць гістарычная энцыклапедыя. Гэта, так сказаць, на дзяржаўным узроўні, а вы паглядзіце, які імпульс для развіцця нацыянальнай мовы атрыманы ў школе. Менавіта наша школа з'яўляецца адным з асноўных падмуркаў нацыянальнага Адраджэння. Яна пакуль знаходзіцца ў пераходным стане. Гэта не самы лепшы перыяд. Але і тут у вучэбным працэсе пераважае беларускамоўнае навучанне. Спадзяюся, што праз год—два наша школа атрымае неабходныя падручнікі.

— *Мне здаецца, асабліва напружаная сітуацыя склалася ў школе з падручнікамі па гісторыі Беларусі.*

— Так. Школьнікам малодшых класаў выкладаюць гісторыю Беларусі без падручніка. Пакуль такога падручніка няма. Ён, праўда, напісаны. Аднак трэба, каб прайшоў неабходную апрабацыю. Раздзелы, адзін за адным, друкуюцца ў "Настаўніцкай газеце". У старэйшых класах па-ранейшаму вучаць гісторыю СССР, ці, як цяпер яе называюць, гісторыю Айчыны. Ну, і самі настаўнікі цікавяцца, вывучаюць гісторыю Беларусі, чытаюць вучням лекцыі. Тут, вядома, важна быць аб'ектыўным і сумленным у ацэнцы ўсіх гістарычных падзей. І не трэба нам маляваць тую гісторыю толькі белай альбо чорнай фарбамі. Не трэба, каб барацьба ідэй захапіла нашу школу. Праз адукацыю, паўсядзённую працу над сабой, праз родную мову можна выхаваць у падрастаючым пакаленні дастойную змену.

— *Мы, век пагарджаныя, ашуканыя, прададзеныя беларусы, сёння ўсё часцей і часцей мовім, што выпадкова, толькі сілаю і зброяй былі выкінуты з еўрапейскай цывілізацыі, далучаны ў прыгон і няволю. Дык хто нас будзе паважаць, пакуль не станем нацыяй, дзяржавай.*

— У нас павінна быць моцная дзяржава, каб заўсёды на Бацькаўшчыне хапала хлеба і месца ўсім яе сынам і дачкам. У нас жа два мільёны беларусаў вымушаны былі па розных прычынах пакінуць родныя гоні, а цяпер, у выніку распаду Імперыі, апынуліся за яе межамі. Некаму, некалі першым трэба зрабіць крок да духоўнага яднання беларускай нацыі. Не трэба думаць, што нехта добры і багаты нам нешта дасць. Адорыць розумам, мы самі павінны ўсё здабыць. Аб'ядналца ў адну сям'ю.

— *А мы што робім? Афіцыйна, на дзяржаўным узроўні дзелім беларусаў ну зусім, як вядомы неўтаймаваны змагар за рускую ідэю Няўзораў, на "нашых" і не нашых". Нашы — гэта ўсе, хто жыве ў Беларусі, яны — грамадзяне, белая каста, а тыя беларусы, хто за межамі, — чужыя, мігранты, адшчапенцы, 'ліміт', адным словам. Да іх і адносіны адпаведныя — пасынкі. Мы хутчэй будзем карміць і абаграваць паўмільёны ўзброеных чужынцаў, але зробім усё, каб толькі не паклікаць сваіх, крэўных сыноў дахаты, як гэта ўжо зрабіла тая ж Украіна. Скажу шчыра, трэба маліць Бога, каб у Беларусі быў мір і спакой, інакш Беларусь апынецца без сваіх абаронцаў, без нацыянальнага войска. Як жа нелагічна і крыўдна мы адштурхоўваем ад сябе тых, на каго маглі б у цяжкую хвіліну абаперціся.*

— 19—20 снежня адбыўся сход беларусаў блізкага замежжа. Гэта, несумненна, быў першы крок да крэўнага яднання беларусаў свету, важкі крок да Сусветнага Кангрэсу беларусаў. Прыняты шэраг заяў і зваротаў да Парламента і ўрада. Беларусы аднадушна заявілі, што дзе б яны ні знаходзіліся, гатовы бараніць дух свой, ісці шляхам яднання, аказваць усялякую дапамогу сваёй Бацькаўшчыне. Для ўсіх Беларусь — клопат і боль. І мы будзем рабіць усё магчымае, каб Айчына ўзнялася з кален, парвала вярыгі манкуртства, вярнула сабе мову і культуру дзядоў сваіх і прадзедаў.

— *Нам як паветра неабходна ідэя адзінай, суверэннай, незалежнай Беларусі. Для гэтага патрэбна палітычная воля нашых лідэраў, заканадаўчых і кіруючых органаў улады. Трэба пакончыць з паўсюднай дэманстрацыяй нашага бяссілля на ўсіх узроўнях улады і асабліва ў знешнепалітычнай дзейнасці.*

— Так, беларуская нацыя пакуль знаходзіцца ў дрымотным стане. Але яна прачнецца. Яна не зжыла сябе, не згубілася на задворках гісторыі. Нам трэба выходзіць з эканамічнай разрухі і ўпадку, знаходзіць шляхі вываду нашага грамадства са стану дэмаралізаванасці, адчування сваёй другараднасці. Мы павінны стаць адным цэлым, аб'яднацца вакол беларускай нацыянальнай ідэі, сваёй нацыянальнай ідэі, сваёй нацыянальнай дзяржавы, сваёй народнай еднасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ